Інквізітарскае вогнішча знішчае свабоду слова на Беларусі

№ 181 (763)

Пятніца, 1 кастрычніка 1999 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць —
5 разоў у тыдзень
Кошт: у кіёсках і крамах —
25000 руб.,
па падпісцы —
18000 руб.,
у індывідуальных
гандляроў — свабодны.

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

Пейджинговую связь редакции обеспечивает
ОБИЛКОМ пейджинг-система
(017) 222-46-51
(017) 222-46-52

Газета сверстана на компьютерах фирмы "ЛИНТЕК"

ОСВЕТИТЕЛЬНОЕ ОБОРУДОВАНИЕ ЛАМПЫ КАБЕЛЬ
8-(017)-213-70-21
8-(017)-213-70-13
Кальченко & К°

Родныя знікшага В.Ганчара звярнуліся да прэзідэнта ЗША і жонкі прэзідэнта Расіі

Родныя першага намесніка старшыні Вярхоўнага Савета Беларусі 13-га склікання Віктара Ганчара, які знік увечары 16 верасня ў Мінску, працягваюць ягоныя пошукі і звяртаюцца да міжнароднай грамадскасці з просьбай дапамагчы знайсці вядомага палітыка.

Жонка В.Ганчара Зінаіда Ганчар накіравала адкрыты ліст прэзідэнту ЗША Білу Клінтану. "У найбольш цяжкія для нашай краіны моманты дэмакратычныя сілы Беларусі заўсёды маглі разлічваць на падтрымку і разуменне Урада Злучаных Штатаў, які з'яўляецца самым надзейным гарантам павагі і выканання правоў чалавека ва ўсім свеце, — піша З.Ганчар. — Сёння дыктатарскі рэжым у Беларусі пераступіў цераз апошнюю рысу". Па словах жонкі вядомага палітыка, гэта канчаткова аддзяліла краіну ад усяго цывілізаванага свету: "лідэраў дэмакратычнага руху больш не кідаюць у турмы, яны проста знікаюць на вуліцах беларускай сталіцы".

Як адзначаецца ў лісце, "праваахоўныя органы Беларусі не прадпрымаюць фактычна аніякіх дзеянняў па вышуку В.Ганчара і А.Красоўскага, а таксама па выяўленні арганізатараў і выканаўцаў гэтага злачынства, хаця з пачатку гэтага года беларускія спецслужбы адкрыта вялі за маім мужам круглясутачнае сачэнне і яны проста не могуць не ведаць, што ж з ім адбылося". "Я звяртаюся да Вас с просьбай умяшацца і дапамагчы спыніць тэрор у Беларусі, а таксама дапамагчы высветліць лёс майго мужа", — піша З.Ганчар. Нагадаем, што некалькі дзён таму жонка В.Ганчара накіравала адкрыты ліст падобнага зместу прэзідэнту Расіі Барысу Ельцыну.

Тым часам маці В.Ганчара Валянціна Адамаўна, ягоныя сёстры Галіна Ганчар, Тамара Навуменка і брат Іосіф Ганчар накіравалі зварот на імя жонкі прэзідэнта Расіі Наіны Ельцынай. "Вось ужо 11 дзён мы не ведаем, дзе ён і што з ім. Ідуць хвіліны, гадзіны... Але час быццам спыніўся ў нашых сем'ях... 24 гадзіны ў суткі чакаем хоць якіх-небудзь звестак, — пішуць аўтары звароту. — Горка і балюча чуць паведамленні ў дзяржаўных СМІ. Мы разумеем, што не можам разлічваць на спачуванне карэспандэнтаў, якія выказваюць афіцыйную пазіцыю ў справе аб выкраданні аднаго з лідэраў апазіцыі. Гэтыя людзі далёкія ад прафесійнай этыкі, іх паведамленні абапіраюцца не на канкрэтныя факты па злачынстве, якое расследуецца, а на здагадкі і неабгрунтаваныя меркаванні... Мы... просім Вас аб дапамозе. Сёння Вы — жонка прэзідэнта. Але быў час, калі Вам таксама давялося шмат перажыць, калі Барыс Мікалаевіч быў лідэрам апазіцыі і змагаўся з рэжымам не менш страшным, чым той, які ўсталяваўся зараз на нашай радзіме — у Беларусі". Блізкія і родныя просяць Н.Ельцыну прадпрыняць усё, што можа быць у яе сілах, каб высветліць лёс В.Ганчара, а таксама "пасадзейнічаць у распаўсюджванні праўдзівай інфармацыі". Ліст З.Ганчар на імя Б.Клінтана перададзены ў Пасольства ЗША ў Мінску, а зварот родных да Н.Ельцынай паступіў у Адміністрацыю расійскага прэзідэнта.

Дзмітрый УЛАСАЎ, БелаПАН.

Нет "Навін", будет "Наша Свабода"

28 сентября 1999 года в столичной типографии "Красная Звезда" в сопровождении двух милиционеров прибыл судебный исполнитель. Несмотря на то, что решение суда Московского района г.Минска еще не вступило в законную силу, он опечатал бумагу, предназначенную для выпуска очередного номера газеты "Навіны", и готовые макеты данного издания.

На пресс-конференции главный редактор Павел Жук прокомментировал это событие следующим образом: "Виктору Шейману деньги, даже 15 миллиардов белорусских рублей, не нужны. Цель разыгранного судебного фарса была одна — закрытие оппозиционного издания".

Коллеги из "Беларускай маладзёжнай" поделились бумагой и очередной, 111-й, номер "Навін" увидел свет. Но это был последний номер данного издания. Высочайший приказ закрыть в судебном порядке эту оппозиционную газету выполнен, можно сказать, досрочно, то есть не дожидаясь окончания всех судебных процедур.

На пресс-конференции, проведенной на следующий день главным редактором теперь уже бывших "Навін", было заявлено, что победа А.Лукашенко и В.Шеймана — пиррова. Буквально на днях независимое издание возобновит выход под новым названием — "Наша Свабода".

Павел Жук планирует увеличить периодичность выхода. Продуманы пути преодоления всех препятствий, чинимых властями, вплоть до печатания газеты в России и распространения ее бесплатно.

Валерий ЩУКИН.

Стоп-кадр



Вось такія чэргі за гарэлкай і рыбай

Зноў знікае то адзін прадукт, то другі. І зноў у Мінску доўгія чэргі. Фотакарэспандэнт засняў чэргі: за гарэлкай, якая выцягнулася каля фірменнага магазіна аб'яднання "Крышталь", і за рыбай у час кірмашу на Кастрычніцкай плошчы.

Фота IREX/ProMedia.

Независимая экспертиза

Станислав БОГДАНКЕВИЧ,
председатель Объединенной гражданской партии,
экс-председатель Национального банка Беларуси

Мертворожденные планы,

или Как стабилизировать белорусский рубль

Уже более двух лет в высших эшелонах власти не прекращаются стенания о необходимости стабилизации валютного курса белорусского рубля и ограничения инфляции, а воз, как говорят, и ныне там. Помнится, нам обещали "единый курс" еще к 1 июля 1998 года. Сегодня делаются новые широковещательные заявления, одобрена Концепция денежно-кредитной политики на 1999—2000 годы, назван новый срок решения этой проблемы — 1 июля 2000 года. Говорится об амбициозных планах накопления крупных золотовалютных резервов. Делаются намеки на проведение крупной деноминации белорусского рубля и на введение к началу 2001 года новой устойчивой валюты.

Простое ознакомление с этими прожектами свидетельствует о глубоком непонимании их инициаторами азов макроэкономики. Смею утверждать, что все эти планы являются мертворожденными. При сохранении у власти этих денежных политиков и этой экономической политики страна обречена на прозябание, белорусский рубль — на дальнейшее обесценивание, цены — на рост.

В Концепции важнейшим условием реализации политики "скользящей фиксации" обменного курса является "доведение чистых иностранных активов Национального банка до величины, покрывающей размер рублевой денежной базы не менее чем на 100 процентов, **что обеспечит конвертируемость рубля по текущим операциям для юридических лиц и возможность беспрепятственного обмена наличных денег на СКВ для физических лиц"**. Вышеприведенная цитата является ярким свидетельством непонимания властями глубинных причин переживаемого страной кризиса, в том числе валютного, и путей выхода из него, подлинного предназначения золотовалютных резервов Национального банка. **Наличие резервов в принципе не может обеспечить конвертируемость рубля.** В действительности резервы играют не главную, а лишь минимальную роль в решении проблемы конвертируемости и свободного обмена наличных рублей на СКВ. Резервы Национального банка — это лишь страховой полис на случай вызванного чрезвычайными обстоятельствами падения "цены" национальной валюты на свободном валютном рынке, на случай спекулятивных колебаний этой "цены". Никакие резервы, в том числе и равные 100-процентному размеру рублевой денежной базы (на 1 августа с.г. примерно 450 миллионов долларов), не стабилизируют белорусский рубль, если будет продолжаться нынешняя политика административно-произвольного управления народным хозяйством. С другой стороны, в условиях отрицательного торгового и платежного балансов задача создания объявленных золотовалютных резервов просто невыполнима. Следует заметить, что реальные инвалютные резервы страны не могут по определению быть созданы за счет государственного фальшивомонетничества, то есть безресурсной эмиссии. **Это азбучная истина.** Эмиссия ведет к неотвратимому росту рублевой денежной базы, увеличению объема денежной массы, ускорению оборота денег, последствием которых являются падение обменного курса, рост цен, инфляционный налог на население и его дальнейшее обнищание, обесценивание рублевых сбережений, утрата оборотного капитала, неплатежи, в том числе невозврат банковских ссуд, дальнейшее углубление кризиса. При огромном валютном "голоде" ее нельзя решить за счет введения 10-процентной обязательной продажи валютной выручки Национальному банку. А для привлечения иностранных инвестиций или продажи иностранцам части государственной собственности необходима полная смена экономического курса, чего и близко нет в данной Концепции.

В Концепции есть немало обоснованных положений и планов. В то же время отсутствует должная последовательность, поражает половинчатость намечаемых решений. За январь—июль 1999 года средняя совокупная денежная масса в стране возросла на 425,5 процента и составила огромную сумму в 277 триллионов рублей. Однако вместо политики ее сокращения поется старая песня об ограниченной эмиссии, говорится лишь о возможном ее сокращении, о допустимости дополнительной эмиссии путем приобретения Национальным банком СКВ. Провозглашено продолжение практики покрытия эмиссией дефицита государственного бюджета, финансирования жилищного строительства. Намечается лишь поэтапный перевод этого строительства на финансирование из иллюзорных неинфляционных источников. Абсолютно неприемлемым представляется положение (особенно для субъектов, специализирующихся на внутреннем рынке) об осуществлении внешнеэкономической деятельности за счет зарабатываемой самими предприятиями СКВ, о запрете приобретения валюты на рынке, кроме целей, определенных правительственными чиновниками, и т. п..

Разумеется, можно начертить на бумаге те либо иные теоретические схемы стабилизации национальной валюты. У правительства А.Лукашенко богатый опыт такого бумаготворчества. Однако на практике они окажутся неосуществимыми без коренной смены проводимого экономического курса и правительственной команды.

Самое первое условие стабилизации рубля — полная и быстрая либерализация цен на все факторы производства товаров и услуг, снятие административных ценовых ограничений на товарных рынках промышленной и сельскохозяйственной продукции, рынках труда и капитала на основе жесткого государственного антимонополизма и конкуренции, а также либерализация как внутреннего, так и внешнего рынка. В условиях ценовой свободы и либеральной торговли все наши соседи победили инфляцию и стабилизировали свои национальные валюты, в то время как в Беларуси при наличии грозного президентского контроля, постоянном поиске "жуликов" и "врагов" и их изоляции продолжается гиперинфляция и обвал обменного курса.

Вторым безусловным условием , необходимым для стабилизации рубля, является политика жесткой договорной и финансовой дисциплины с отработанным механизмом санации и банкротств неплатежеспособных предприятий и колхозов, отказ от практики льготирования и безвозвратного "кредитования" неэффективного производства, ведущего к огромному расточительству и падению рентабельности.

Реальным источником создания необходимых инвалютных резервов может быть лишь активное сальдо торгового или платежного балансов. Иного не дано. В наших нынешних условиях при пассивном сальдо вместо создания собственных резервов необходимо получение у Международного валютного фонда соответствующего стабилизационного кредита. Как известно, такой кредит на весьма льготных условиях — на срок порядка 15—17 лет под 5,5—6 процентов годовых — может быть получен, если страна вернется на столбовую дорогу цивилизованного хозяйствования, откажется от разорительного строительства административной "семейной экономики", лукашенковского "рыночного социализма".

Что необходимо осуществить для стабилизации национальной валюты, прекращения роста цен, притока внешних инвестиций? Прежде всего необходимо осознать, что стабилизация рубля невозможна на базе нынешней экономической политики. Наибольший вред экономическому здоровью Беларуси нанесли правительственные решения, приведшие к разбалансированию (несовместимости) монетарной, фискальной, производственной, торговой, инвестиционной и социальной политики. Новый экономический курс страны должен содержать в себе:

(Окончание на 2-й стр.)

Запазычанасць за газ, цеплавую і электраэнергію з пачатку года выросла ў 3,6 раза

У 1999 годзе ў Беларусі назіраецца зніжэнне ўзроўню аплаты спажыўцамі за выкарыстоўваемы прыродны газ. Так, калі ў студзені-жніўні 1998 года яны аплачвалі 96,7 працэнта кошту ўжытага газа, то сёлета — 85,2 працэнта. Гэтыя звесткі былі прыведзеныя на пасяджэнні прэзідыума Савета Міністраў Беларусі, якое адбылося гэтымі днямі.

Агульная запазычанасць спажыўцоў за газ дасягнула да 1 верасня 1999 года 99,1 трыльёна рублёў. У гэтай суме асабліва вялікая доля канцэрна "Белэнерга" (78,1 працэнта). Узрастанне яго доўгу, на думку спецыялістаў, абумоўлена неплацяжамі спажыўцоў за энергію і павелічэннем крэдыторскай запазычанасці мінулых гадоў з-за яе індэксацыі.

Самы буйны даўжнік з ліку прадпрыемстваў, што ўжываюць прыродны газ, — Лукомльская ДРЭС (яна запазычыла каля 69 трыльёнаў рублёў). Паводле звестак канцэрна "Белэнерга", даўгі спажыўцоў за энергію на 1 верасня склалі 53,4 трыльёна рублёў, павялічыўшыся з пачатку года больш чым у тры разы. Каля 60 працэнтаў гэтай запазычанасці прыпадае на прадпрыемствы Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. І гэта нягледзячы на прадастаўленне галіне розных ільгот, у тым ліку адтэрміновак па ўплаце запазычанасці за энергію, выдзяленне на гэтыя мэты сродкаў з рэспубліканскага бюджэту і фондаў, ільготнага мэтавага крэдытавання.

Сяргей СНЕГІН.

В Минск приезжает Вольфганг Берендт

С 4 по 6 октября с наблюдательной миссией Минск посетит докладчик политического комитета Парламентской Ассамблеи Совета Европы (ПАСЕ) г-н Вольфганг Берендт.

Г-н Берендт проведет консультации с представителями официальных властей, политической оппозиции и неправительственных организаций, в частности, по вопросам соблюдения прав человека.

Совет Европы был основан в 1949 году. На сегодняшний день членами этой международной организации является 41 государство. Страны, входящие в Совет Европы, обязуются поддерживать демократические институты, руководствоваться принципом верховенства закона и соблюдать свои международные обязательства. Советом Европы был учрежден Европейский суд по правам человека. Кроме того, Совет Европы недавно назначил специального уполномоченного по правам человека, который подчиняется непосредственно Генеральному секретарю данной организации.

Статус Беларуси в качестве наблюдателя в Совете Европы был приостановлен в 1997 году. Предшественник г-на Берендта на посту докладчика Политического комитета ПАСЕ, г-н Антреттер посетил Минск в ноябре 1998 года. В начале 1998 года Политический комитет ПАСЕ провел консультации с представителями Национального собрания и Верховного Совета в г.Страсбурге, где находится штаб-квартира Совета Европы.

Г-н Вольфганг Берендт является депутатом парламента Германии (Бундестага). Он является членом социал-демократической фракции парламента. Г-н Берендт принимал участие в Бухарестской встрече представителей политической оппозиции и третьего сектора Беларуси (неправительственных организаций, профсоюзов научно-исследовательских институтов). Встреча была организована специальной рабочей группой по Беларуси Парламентской группы ОБСЕ (руководитель группы г-н Адриан Северин) и Консультативно-наблюдательной группы ОБСЕ в Минске. Данная встреча проходила с 11 по 14 июля 1999 года.

Консультативно-наблюдательная группа ОБСЕ в Беларуси.

Мытнікі чарговы раз спынілі спробу нелегальнага перавозу буйной сумы замежнай валюты

Спроба незаконна перавезці цераз беларуска-польскую мяжу 40 тысяч долараў ЗША была днямі спынена супрацоўнікамі Брэсцкай мытні. Як паведаміў намеснік начальніка мытні Мікалай Ігнацэвіч, валюту спрабаваў правезці грамадзянін Украіны Б., які ехаў за мяжу, накіроўваючыся да месца працы — у Англію — цягніком N 103 "Мінск—Варшава". Валюта не была задэкларавана, таму яе паліцыі кантрабандай і канфіскавалі.

Паводле слоў М.Ігнацэвіча, усяго за восем месяцаў бягучага года супрацоўнікамі мытні было канфіскавана долараў ЗША на суму 120 мільярдаў рублёў (па курсе Нацыянальнага банка РБ) — 534 выпадкі кантрабанды, нямецкіх марак на суму 46 мільярдаў рублёў (247 выпадкаў), расійскіх рублёў на суму 2,5 мільярда (35 выпадкаў). За гэты ж перыяд супрацоўнікі мытні 25 раз канфіскоўвалі залатыя вырабы на агульную суму 16 мільярдаў рублёў, больш за 730 абразоў і іншых прадметаў культу на суму каля 29 мільярдаў беларускіх рублёў.

Валянціна КАЗЛОВІЧ.

Р.Барадулін і В.Быкаў супраць расколу БНФ

Рыгор Барадулін накіраваў у штаб-кватэру Беларускага народнага фронту ліст-удакладненне. У ім вядомы беларускі паэт выкладае сваю пазіцыю ў адносінах да IV з'езда, які быў праведзены часткай актывістаў БНФ 26 верасня і на якім было заяўлена аб стварэнні Кансерватыўна-хрысціянскай партыі БНФ. На з'ездзе была абвешчана прапанова старшыні БНФ Зянона Пазьняка ўключыць у склад Сойма новай партыі Рыгора Барадуліна і пісьменніка Васіля Быкава. "Я прызнаю статут БНФ "Адраджэнне" і статут партыі БНФ без усялякіх змяненняў, у тым ліку і ў назве партыі, — заявіў у сваім лісце Р.Барадулін. — Гатовы працаваць у Фронце і яго органах, калі з'езд партыі і руху пройдуць адначасова і выберуць агульнае кіраўніцтва. Я быў, ёсць і буду супраць расколу Фронту ні пры якіх варыянтах. Толькі адзінства — наша сіла".

Як паведаміў на прайшоўшай 28 верасня прэс-канферэнцыі намеснік старшыні БНФ Лявон Баршчэўскі, такую ж пазіцыю займае і Васіль Быкаў. Паводле слоў Л.Баршчэўскага, пра гэта пісьменнік заявіў яму ў тэлефоннай размове.

Элизабет Шредтер обеспокоена ситуацией в Беларуси

Представитель Хартии'97 в Брюсселе Александр Силич встретился 28 сентября в Брюсселе с вице-президентом парламентской делегации по вопросам отношений ЕС с Украиной, Беларусью и Молдовой Элизабет Шредтер.

Г-жа Шредтер была проинформирована о последних событиях в Беларуси: исчезновении Виктора Гончара, попытке покушения на Семена Шарецкого, атаке властей на независимые СМИ, а также о приготовлениях белорусской оппозиции к Маршу Свободы, который планируется провести в Минске 17 октября.

Госпожа Шредтер выразила крайнюю обеспокоенность ухудшением политической ситуации в Беларуси, а также осудила действия Лукашенко по окончательному удушению демократии в Беларуси.

С Элизабет Шредтер были также обсуждены детали предстоящей встречи между представителями белорусской демократической оппозиции и депутатами Европарламента, которая состоится, вероятнее всего, в декабре этого года в Брюсселе.

Накануне Шредтер направила Александру Лукашенко письмо, в котором она требует от его правительства немедленно определить местонахождение Виктора Гончара и Анатолия Красовского, равно как и исчезнувших ранее Юрия Захаренко и Тамары Винниковой. Как отмечает г-жа Шредтер, "вера евроструктур в готовность вашего правительства в дальнейшем способствовать демократизации общества зависит от того, насколько быстро будут расследованы случаи исчезновения людей".

Пресс-центр Хартии'97.

Размещая рекламу на страницах "Народной воли", Вы не только укрепляете свой бизнес, но и строите новую Беларусь!

Рекламу не обязательно доставлять в редакцию, ее можно вместе с гарантийным письмом передать по факсу:

(017) 229-29-04.
Телефон для справок: (017) 229-29-06.

ВИПРОСТ
ТРУБЫ и ФИТИНГИ
ИЗ ПОЛИПРОПИЛЕНА
(производство Чехия)
ЦЕНЫ СНИЖЕНЫ на 20%
для холодного и горячего водоснабжения
Т./ф. (017) 228-14-90, Т. (017) 228-12-97
товар сертифицирован

Адкрылася персанальная выстава вядомага беларускага мастака Эдуарда Агуновіча

У Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі адкрылася персанальная выстава заслужанага работніка культуры Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь мастака Эдуарда Агуновіча.

У экспазіцыі прадстаўленыя шматлікія творы выдатнага беларускага графіка і мастака-афарміцеля, у тым ліку ягоныя праекты і мастацкія распрацоўкі помнікаў, музейных экспазіцый, а таксама мастацкая канцэпцыя рэканструкцыі Верхняга горада — гісторыка-культурнага цэнтра Мінска. Сярод найбольш вядомых твораў Э.Агуновіча — праекты мастацкага афармлення экспазіцый Літаратурнага музея Янкі Купалы ў Мінску і яго філіі ў вёсцы Вязынка Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці, сталічных Літаратурна-мемарыяльнага дома-музея Якуба Коласа і Літаратурнага музея Максіма Багдановіча, а таксама Музея савецка-польскай баявой садружнасці ў вёсцы Леніна Горацкага раёна Магілёўскай вобласці і філіі Нацыянальнага музея гісторыі і культуры ў Заслаўі Мінскага раёна. Выстава будзе працаваць да 29 кастрычніка.

Марат ГАРАВЫ.

За "Маршам Свабоды" прыедуць назіраць шматлікія прадстаўнікі міжнароднай супольнасці

Правядзенню 17 кастрычніка ў Мінску стотысячнай акцыі пратэсту — "Марш Свабоды" — была прысвечана прэс-канферэнцыя, якая адбылася ў штаб-кватэры Беларускага народнага фронту. Удзел у ёй узялі шэраг вядомых палітыкаў — старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада) Мікалай Статкевіч, намеснік старшыні БНФ Вінцук Вячорка і актывіст Аб'яднанай грамадзянскай партыі Павел Данэйка.

В.Вячорка паведаміў, што ў Мінскі гарвыканкам пададзена заяўка на правядзенне шэсця і мітынгу, якую падпісалі 22 беларускія палітыкі. Мэта маючай адбыцца акцыі — выказванне падтрымкі перамоўнаму працэсу паміж уладамі і апазіцыяй, а таксама патрабаванні аднавіць дэмакратыю і законнасць у Беларусі і інтэграваць краіну ў міжнародную супольнасць. Шэсце, па задуме арганізатараў, павінна распачацца а 12-й гадзіне на сталічнай плошчы Якуба Коласа і прайсці па праезнай частцы праспекта Францішка Скарыны да плошчы Незалежнасці, дзе з 14 да 20 гадзін павінен прайсці мітынг.

Паводле слоў М.Статкевіча, правядзенне "Маршу Свабоды" аб'ядналі апазіцыі выклікала пільную ўвагу за мяжой. Для назірання за правядзеннем акцыі ў Мінск павінны прыбыць прадстаўнікі розных партый, грамадскіх і праваабарончых арганізацый, парламентаў шэрагу еўрапейскіх краін і структур Еўрасаюза.

На думку П.Данэйкі, настроі грамадзян Беларусі такія, што заяўленая арганізатарамі лічба ўдзельнікаў маршу — 100 тысяч чалавек — цалкам рэальная і нават можа быць значна большай. "Сёння мы стаім на парозе праявы рашучасці тых, хто хоча адказваць за сваю будучыню, — заявіў П.Данэйка. — Або мы зробім рашучы крок да пералому палітычнай сітуацыі, або пагодзімся з тым, што намі можа распараджацца кожны, хто захоціць у краіне ўладу". Галоўнай сілай маршу, адзначыў ён, павінны стаць моладзь, прафсаюзныя актывісты і прадпрымальнікі.

Каардынатар Хартыі'97 Дзмітрый Бандарэнка выказаў здагадку, што ўлады могуць зрабіць гэтак жа, як яны зрабілі з заяўкай прафсаюзаў на правядзенне акцыі 30 верасня — гэта значыць, перанесці яе на аддаленую і непрыстасаваную для масавых мерапрыемстваў плошчу Бангалор. "Забарона акцый пратэсту — гэта парушэнне Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, які быў ратыфікаваны Рэспублікай Беларусь, — сказаў Д.Бандарэнка. — У Жэневе беларускія ўлады ўзялі на сябе абавязацельства аб уступленні на працягу года ў Савет Еўропы. Рашэнне аб забароне шэсцяў для прафсаюзаў і магчымая забарона "Маршу Свабоды" ёсць грубае парушэнне гэтых абавязацельстваў. Мы настойваем, што парадак і бяспека грамадзян будуць выкананыя ў тых месцах, дзе традыцыйна праводзяцца акцыі апазіцыі. У іх ліку — плошча Незалежнасці і праспект Скарыны ў Мінску".

Генадзь БАРБАРЫЧ, БелаПАН.

Надвор'е

1 і 2 кастрычніка воблачнае з праяснennямі надвор'е. 1-га месцамі дождж, 2-га — пераважна без ападкаў. Вецер паўднёва-заходні 6—11 м/с. Тэмпература паветра ўначы 1-га +9...+14, 2-га +6...+11; удзень +14...+19, па поўдні да +22.

П		4	11	18	25
А		5	12	19	26
С		6	13	20	27
Ч		7	14	21	28
П	1	8	15	22	29
С	2	9	16	23	30
Н	3	10	17	24	31

ДЗЕНЬ ПАЖЫЛЫХ ЛЮДЗЕЙ

КАСТРЫЧНІК

1

'99 ПЯТНІЦА

Усход 6.11
Захад 17.46
Даўж. дня 11.35

Апошн. квадра 2 кастрычніка
Захад 14.49
Усход 22.51

Народная Воля 1 КАСТРЫЧНІКА 1999 г.

Мертворожденные планы,

или Как стабилизировать белорусский рубль

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

1. Денежно-финансовую стабилизацию, то есть восстановление свободного денежно-кредитного и валютного рынков и автономии Национального банка. Отказ от кредитной экспансии, отрицательной ставки процента, обязательной продажи СКВ. Введение рыночной системы обменного курса. Обеспечение развития страховых, инвестиционных, трастовых компаний, пенсионных фондов.

2. Амнистию доходов всех юридических и физических лиц на 3 года.

3. Обеспечение жесткой договорной и финансовой дисциплины с отработанным механизмом санации и банкротств.

4. Полную либерализацию цен, в том числе на кредиты. Эффективную систему индивидуальной поддержки малоимущих. Реализацию на практике полной государственной ответственности за обеспечение прожиточного минимума для всех граждан страны, пенсионное обеспечение, здравоохранение и образование.

5. Утверждение графика отмены дотаций и субсидий коммунальному хозяйству, энергетике, транспорту, топливному сектору.

6. Полную отмену налоговых льгот для экономических субъектов.

7. Существенное сокращение и упрощение государственной бюрократии. Безотлагательное реформирование системы управления, государственного контроля, силовых структур, социальной сферы.

8. Ликвидацию внебюджетных фондов и гипертрофированных фондов президента. Восстановление в полном объеме контроля парламента за бюджетом и использованием госимущества.

9. Приватизацию и демонополизацию. Развитие рыночных институтов. Государственную поддержку малого бизнеса. Реформирование колхозно-совхозного села на базе частной собственности на землю и свободы предпринимательства.

10. Выработку эффективной торговой, промышленной и сельскохозяйственной политики.

11. Возврат к политике тесного сотрудничества с МВФ и другими международными финансовыми институтами. Создание условий для притока инвестиций, новейших технологий и оборудования в страну.

Стабилизация валюты и цен в условиях их либерализации, демонополизация экономики и приватизация — важнейшие слагаемые, без которых невозможно достижение успеха в привлечении крупных инвестиций и в создании конкурентной экономической среды. Цены — главный, если не единственный, ориентир для эффективного размещения ресурсов. Сегодня в Беларуси измерение подлинной эффективности того либо иного производства крайне затруднено из-за искажений цен в силу инфляции, завышенного обменного курса, льготирования, субсидирования, перекрестного субсидирования в энергетике и газовой отрасли, различных внутренних ограничений и незавершенности структурных преобразований. Они должны формироваться не под влиянием правительственных решений, а в силу действия конкурентных рыночных сил, отражая реальную потребность рынка в определенных товарах и услугах и обеспечивая максимальную эффективность инвестору и экономический рост.

Эта задача в принципе вполне жизнеспособна и решаема. Беларусь с ее исключительно выгодным географическим положением, тесными связями как с традиционным восточным, так и богатым западным рынком, неплохой производственной инфраструктурой, квалифицированной и дисциплинированной рабочей силой, незначительной, по мировым стандартам, внешней задолженностью обладает огромным потенциалом для расширения притока иностранного капитала как в форме прямых инвестиций, так и кредитов. Для ее реализации нужна лишь политическая воля, команда профессионалов-реформаторов, ясно представляющих пути решения этой проблемы, и строго выверенная программа действий, в основе которой лежит создание условий и ориентация любых субъектов хозяйствования на получение максимальной прибыли и ее использование на накопление и высокоэффективные инвестиции. Ее реализация практически невозможна без достижения соответствующего соглашения с МВФ и МБРР и получения от них значительной технической и финансовой поддержки.

Что подразумевается под "хорошим инвестиционным климатом"? Прежде всего создание в стране такой деловой среды, которая обеспечивала бы любому инвестору как внутреннему, так и иностранному, право самостоятельно управлять своим бизнесом, где вопросы разрешений на инвестиции, приобретение земли или акций, формирование цен, налоговые и иные платежи решаются прозрачными, одинаково обязательными для всех и безусловно стабильными законами, а не исполнительными органами власти, не требуют специальных обращений к государственным чиновникам и их "стимулирования". Создание в стране такой деловой конкурентной среды, где гарантировалось бы право на получение любым инвестором максимально возможного дохода при минимальном риске, где государственный контроль за инвестором и производителем был бы ограничен жесткими рамками закона и соответствовал бы европейским стандартам.

Главное, что необходимо гарантировать, это: а) макроэкономическое равновесие; б) либерализацию цен, демонополизацию и приватизацию; в) прозрачные и справедливые правовые основы и высокий уровень экономической свободы для предпринимательства; г) высокую степень реальной безопасности частной собственности; д) прозрачное и справедливое налогообложение; е) более высокие в сравнении с другими странами с переходной экономикой реальные доходы на вложенный капитал на белорусском рынке.

Макроэкономическое равновесие — это прежде всего низкий уровень инфляции и стабильный валютный курс. Равновесие между совокупным спросом и внутренним производством, между спросом и предложением инвалюты достигается прежде всего строгой денежно-кредитной политикой, отказом от политики кредитной экспансии и заниженных процентных ставок, введением жесткой финансовой и бюджетной дисциплины вплоть до банкротства для всех без исключения предприятий, включая государственные, открытой внешнеторговой политикой, конкурентным ценообразованием, введением режима свободной текущей конвертируемости белорусского рубля по рыночному курсу, формируемому под действием ничем не ограниченных спроса и предложения. Первичным условием для достижения макроэкономического равновесия, с одной стороны, является отказ президента и правительства от вмешательства в деятельность Национального банка, прежде всего в вопросы денежно-кредитной эмиссии, вопросы рефинансирования коммерческих банков (только через аукционы), в процентную политику и валютное регулирование, с другой — обеспечение режима строжайшей экономии, ограничение дефицита государственного бюджета пределом в 2 процента от ВВП. При этом максимальный внешний долг страны за счет инвестиций в новейшую технологию и экспорт мог бы быть увеличен до 4 миллиардов долларов (до 30 процентов от ВВП).

Эффективная рыночная экономика без свободного конкурентного формирования цен немыслима. Для создания конкурентной среды необходима максимальная демонополизация экономики. Монополистические рыночные структуры, прежде всего розничные и оптовые торговые и снабженческие организации, монопольные образования в жилищном секторе и другие необходимо упразднить. Однако только демонополизация сама по себе недостаточна. Необходима широкая приватизация, а также снятие всяких препятствий для развития частного предпринимательства, в том числе барьеров для создания и закрытия предприятий, вывоза прибыли и возврата капитала. Демонополизацию на внутреннем рынке продукции таких наших крупных предприятий, как автомобильный, тракторный и другие заводы-монополисты, работающие в основном на экспорт, можно было бы обеспечить путем внешней открытости рынка, сохранив на первом этапе лишь небольшую защиту от производителей из-за рубежа. Разумеется, в тех структурах, где демонополизация невозможна, контроль за монополистами должен быть сохранен. Кроме того, требуется ликвидация любых факторов, искажающих уровень цен, естественной реальной рентабельности производства, стоимость банковского (денежного) капитала, как то: льготирование, субсидирование, материальная поддержка неэффективных предприятий в любой форме, неодинаковое, неравновеликое и нестабильное налогообложение. Всякое искажение стоимости дезинформирует инвесторов, субъекты рынка, однако, что очевидно, не отменяет известное положение о том, что в принципе невозможно реально снизить цену на какой-либо товар ниже стоимости производства в целом для всего общества, для всей страны. Очевидно, одним из привлекательных для инвесторов аргументов в пользу инвестирования в экономику Беларуси было бы совершенствование Таможенного союза с Россией в направлении уменьшения или полной ликвидации налогов и тарифов на импортируемое оборудование и материалы для национального производства из третьих стран.

Важным слагаемым успеха является обеспечение для любого инвестора полной свободы выбора: где инвестировать, что производить, как производить, какую сохранять численность рабочей силы, для кого производить, по какой цене и в какой стране продавать, а также права собственности на земельные участки для создания коммерческого предприятия. Частный бизнес должен быть защищен от дискриминационного применения нормативных актов, предвзятых проверок контролирующих органов, дискриминации в области кредитования, "драконовских" штрафов и сумм арендной платы, "выбивания" лицензий, разрешений, регистраций, согласований и других проволочек, любой зависимости от доброй либо злой воли государственной бюрократии.

Цены не имеют экономического смысла, если субъекты рынка не платят по счетам, живут не по средствам. Длительные задержки в платежах, характерные для нынешнего состояния нашей экономики, искажают цены и реальную эффективность инвестиций, приводят к неэффективному, расточительному использованию ресурсов. Жесткая финансовая дисциплина — безусловная составляющая эффективной рыночной экономики. Без дисциплины и строгой имущественной ответственности нельзя создать привлекательной деловой среды для инвестора. Жесткая дисциплина предполагает отказ от субсидирования банкротов, включая и скрытую форму, посредством принудительного банковского кредитования, недопущение просроченных платежей между субъектами, широкое использование залогового права собственности на землю и недвижимость. Инструментом, безусловно гарантирующим соблюдение строгих финансовых отношений в экономике, выполнение заключенных контрактов, является только реальная угроза банкротства. Кроме того, должна быть отменена всякая иная очередность платежей, кроме, возможно, календарной. Все платежные обязательства должны иметь одинаковую силу. Иного не дано. Это основа всякого бизнеса и частных инвестиций.

В конкуренции за инвестиционные ресурсы большую роль играет налогообложение. Задача улучшения инвестиционного климата требует создания в Беларуси хотя бы такой же налоговой среды, как в странах-конкурентах с аналогичным уровнем доходов на душу населения. Налоговая система Беларуси должна соответствовать международным нормам, быть прозрачной, справедливой, ясной для понимания и расчета платежей. Прежде всего, следовало бы упразднить внебюджетные фонды и целевые налоги, кроме общепринятых в мировой практике. Уровень налоговой нагрузки на экономику у нас должен быть снижен как минимум в 1,5 раза. Необходимо также сократить численность налогов, количество дифференцированных ставок по отдельным налогам, прекратить практику налоговых льгот для отдельных субъектов, осуществить переход к международным стандартам бухгалтерского учета. Все конкурирующие субъекты и инвесторы должны быть поставлены в одинаковые условия хозяйствования, платить одни и те же налоги на аналогичные виды деятельности или доходы.

Очевидно, сокращение налогового бремени на экономику предполагает сокращение государственных расходов. Следовало бы, исходя из опыта стран с таким же, как у нас, уровнем дохода, ограничить государственные расходы в пределах 25 процентов от ВВП. Одновременно с этим необходимо покончить с наличием в стране теневого президентского бюджета (финансирование через управление делами президента), а также квазифискального бюджета, финансируемого через банковскую систему ("кредитование" АПК, нерентабельных госпредприятий, жилищного строительства и т. п.). Для сокращения государственных расходов необходимо реформирование наряду с экономикой системы государственного управления, армии, милиции, социальной сферы.

Благоприятный инвестиционный климат предполагает наличие в стране реально функционирующей правовой, законодательной базы, особенно в отношении частной собственности, а также независимой от правительства судебной системы, обеспечивающей строгое соблюдение законов. Прозрачные и справедливые правовые основы должны гарантировать потенциальным инвесторам равные условия, при которых правила игры понятны и одинаковы для всех. При создании такой деловой среды Беларусь сможет реализовать свой безусловный шанс стать процветающей европейской страной.

(Аналитическая группа Z.)

Стоп-кадр

Механизатор колхоза "20-й партсъезд" Витебской области Владимир Шакута с помощью тонкого шланга сливает из бензобака своего трактора горючее в ведро, чтобы отмыть руки после ремонта машины.
Фото IREX/ProMedia.

Работнікі сельскай гаспадаркі — самая нізкааплачваемая катэгорыя насельніцтва Віцебскай вобласці

Праца на калгасных палях і фермах застаецца самай нізкааплачваемай у народнай гаспадарцы Віцебскай вобласці. За жнівень, падчас правядзення ўборачнай кампаніі, сярэднестатыстычнаму калгасніку было налічана менш за 11,5 мільёна рублёў (для параўнання: пражытачны мінімум для працаздольнага насельніцтва ў жніўні ў краіне складаў 11 мільёнаў 345 тысяч 737 рублёў). У два разы вышэй — 22,4 мільёна рублёў — ацэньваецца праца сярэднестатыстычнага служачага органаў дзяржаўнага кіравання. Утрая вышэй, чым у калгасах, атрымалі заработную плату ў жніўні работнікі сферы крэдытавання і страхавання — 34,3 мільёна рублёў.

Між тым, ні ў якой іншай галіне работнік не рызыкуе сваім здароўем і жыццём так, як у сельскай гаспадарцы. Паводле звестак абласнога ўпраўлення Камітэта па інспекцыі працы, толькі за апошні летні месяц у аграпрамысловым комплексе Віцебскай вобласці загінулі дзевяць чалавек; ячшэ дзевяць — атрымалі цяжкія калецтвы.

Леанід СІМАНАЎ.

Беларускія спецыялісты і кіраўнікі маюць магчымасць прайсці стажыроўку ў фірмах Германіі

Беларуская гандлёва-прамысловая палата сумесна з нямецкім таварыствам імя Карла Дуйсберга праводзіць конкурс на удзел у праграме павышэння кваліфікацыі для беларускіх спецыялістаў і кіраўнікоў у сферах эканомікі, камерцыі і тэхнікі. Праграма, якая фінансуецца Міністэрствам замежных спраў Германіі, прадугледжвае стажыроўку ў нямецкіх фірмах. Кандыдаты мусяць быць не старэй за 35 гадоў, мець стаж працы па спецыяльнасці не меньш за 2 гады, добра валодаць нямецкай мовай і камп'ютэрнымі праграмамі Word і Excel. Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па тэлефоне (017) **226-91-29.**

Алесь АБРАМОВІЧ.

47 працэнтаў акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі скончылі беларускія ВНУ

Вучоныя алдзела сацыялогіі навукі Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (НАНБ) завяршылі даследаванне, накіраванае на вывучэнне асаблівасцяў станаўлення навуковай эліты краіны з 1928 года па цяперашні час.

Аналіз біяграфій акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў НАНБ — выхадцаў з Беларусі — паказаў, што ў большасці выпадкаў месцам іх нараджэння з'яўляецца сельская мясцовасць. У Мінску нарадзілася толькі 9 працэнтаў акадэмікаў НАНБ, у абласных цэнтрах — 6 працэнтаў, у раённых цэнтрах — 14 працэнтаў, у той час як у сельскіх паселішчах — 71 працэнт.

Даследаванне таксама паказала, што асноўны ўклад у падрыхтоўку нацыянальнай навуковай эліты быў зроблены ВНУ Беларусі (47 працэнтаў), Расіі (40) і Украіны (6 працэнтаў). 4 працэнты акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў НАНБ скончылі ВНУ іншых краін. І 3 працэнты прадстаўнікоў навуковай эліты ў аналізуемы адрэзак часу не маюць вышэйшай адукацыі.

Леанід ІГНАЦЬЕЎ.

У Брэсцкай вобласці ўведзены абмежаванні на продаж гарэлкі

У крамах Брэсцкай вобласці ўстаноўлены ліміт на рэалізацыю гарэлкі айчыннай вытворчасці — не больш за дзве бутэлькі ў адны рукі.

Такое абмежаванне мясцовыя ўлады былі змушаныя ўвесці з-за гарэлачнага дэфіцыту, які, як і па ўсёй краіне, назіраецца ў крамах вобласці. На думку спецыялістаў, апрача шматлікасці прычын (недахоп збожжа, павышэнне цэн на энерганосьбіты і г.д.), "вінаўнікамі" гарэлачнага ажыятажу сталі і самі пакупнікі: паводле звестак статыстыкі, продаж алкагольных вырабаў у першай палове 1999 года ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага ўзрос на 18,6 працэнта. Напрыклад, у Брэсце ў апошні месяц набыць "сарака-градусную" можна было толькі ў фірменнай краме мясцовага лікёра-гарэлачнага завода, ды і то, адстаяўшы чаргу ў 50—100 чалавек. Разам з тым кіраўніцтва завода сцвярджае, што вытворчасць гарэлкі сёлета не знізілася.

